/src/2003_Convention_Basic_Texts-_2018_version-RU.pdf. – Дата доступа: 18.07.2021. – Дата доступа: 17.10.2021.
5. Климов, Л. А. Нематериальное наследие и музей / Л. А. Климов // Музей. – 2013. – № 7. – С. 10–12.
6. Поляков, Т. П. Музейная экспозиция: методы и технологии актуализации культурного наследия / Т. П. Поляков. – М., 2018. – С. 15–20.
7. Стратегия государственной культурной политики на период до 2030 года: утв. Распоряжением Правительства Российской Федерации от 29 февраля 2016 г. №326-р: ред. от 30 марта 2018г. // Электронный фонд правовой и нормативно-технической документации АО «Кодекс». – Режим доступа: http://docs.cntd.ru /document/420340006. – Дата доступа: 17.06.2021.

**Бараноўскі А. В.**

## КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ СЕННЕНСКАГА РАЁНА, ЯКІЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ УЗЯТЫ ПАД АХОВУ ДЗЯРЖАВЫ

***Ключавыя словы:*** культурная каштоўнасць, Сенненскі раён, ахова культурнай спадчыны

Сёння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь унесены 21 аб’ект, які знаходзіцца на тэрыторыі Сенненскага раёна. У асноўным гэта курганныя могільнікі і брацкія магілы. Архітэктура ў Дзяржаўным спісе прадстаўлена наступнымі аб’ектамі: будынак былой земскай управы і пажарнай часці ў г. Сянно, комплекс былой сядзібы Беліца ў аг. Полымя, комплекс будынкаў былой паштовай станцыі ў в. Паграбёнка. Дадзены спіс з’яўляецца, на наш погляд, няпоўным, паколькі ў рэгіёне яшчэ ёсць шэраг культурных каштоўнасцей, якія павінны быць узяты пад ахову дзяржавы. Так, самым старажытным мураваным будынкам у г. Сянно з’яўляецца жылы корпус францысканскага кляштара і ён не ўнесены ў вышэйзгаданы спіс. На дарозе Віцебск–Ходцы, каля в. Задарожжа знаходзіцца сядзібны дом Бабічаў – адзіны сядзібным домам на тэрыторыі раёна, які захаваўся да нашых дзён. Яўрэйскія могілкі ў г. Сянно і ў в. Казлоўка таксама могуць быць узяты пад ахову дзяржавы.

Жылы корпус францысканскага кляштара ў г. Сянно з’яўляецца самым старажытным мураваным будынкам у горадзе, знаходзіцца каля касцёла Святой Тройцы. Пабудаваны ў 1809 г. Стваральнік невядомы. На цяперашні момант будынак выкарыстоўваецца як мясной цэх і знаходзіцца ў добрым стане. Тэхнічная дакументацыя адсутнічае.

Францысканскі кляштар быў заснаваны ў 1772 г. Манахі спачатку жылі ў драўляным будынку, а потым, у 1809 г. быў пабудаваны цагляны кляштар. У самым пачатку дзейнасці францысканцаў канвент кляштара складаўся з 16 чалавек: дзесяці святароў, чатырох клірыкаў,

двух братоў (без пасведчання). Манахі адкрылі першую ў Сянно школу, у якой навучаліся толькі хлопчыкі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі кляштар выкарыстоўваўся ў якасці казармы часцей асобага прызначэння па барацьбе з бандытызмам. Потым у ім размяшчаўся Дом селяніна, ваенны камісарыят. У гады Вялікай Айчыннай вайны будынак былога корпуса францысканскага кляштара быў часткова разбураны. Пасля аднаўлення ён выкарыстоўваўся як склад райспажыўсаюза, а затым – каўбасны цэх [1, с. 79–82].

Сучасны выгляд будынка значна адрозніваецца ад свайго першапачатковага выгляду: частка аконных і дзвярных праёмаў закладзена, адсутнічае драўляная галерэя, да будынка прыбудаваны цагляныя дапаможныя памяшканні. Жылы корпус францысканскага кляштара магчыма аднавіць у першапачатковым выглядзе.

Сядзібны дом Бабічаў у в. Рамшына Машканскага сельскага савета. З'яўляецца адзіным сядзібным домам на тэрыторыі раёна, які захаваўся да нашых дзён. Знаходзіцца на дарозе Віцебск – Ходцы, каля в. Задарожжа. Пабудаваны ў пачатку XX ст. уладальнікамі маёнтка Бабічамі. На цяперашні момант будынак знаходзіцца ў добрым стане і выкарыстоўваецца як падворак Маркава мужчынскага манастыра ў гонар Святой Троіцы. Тэхнічная дакументацыя адсутнічае.

У мінулым в. Рамшына была падзелена на два паселішчы: Вялікае Рамшына і Малое Рамшына. У апошнім знаходзіўся радавы маёнтак Бабічаў – Насекіна. У 1882 г. ён перайшоў у спадчыну да Віктара Ігнатавіча Бабіча, які ажаніўся з Марфай Іванаўнай. У сям'і было двое дзяцей – сын Анатоль і дачка Вольга.

У пачатку XX ст. Бабічы пабудавалі сядзібны дом з цэглы ў класічным стылі. Панскі дом мае выразныя раздзяленні на чатыры часткі. Фасад упрыгожаны плоскімі калонамі-пілястрамі і дэйтыкуламі (пад дахам). Ганак багата аздоблены калонамі з каменнымі ўпрыгожваннямі і фігурнымі карнізамі, над якімі ўзвышаецца атык у выглядзе мезаніна з шырокім балконам.

У цяперашні час балкон замураваны цэглай. Чатыры часткі фасада праразаюць восем акон прамавугольнага тыпу з фігурнымі карнізамі. Першапачаткова з тыльнага боку будынак меў драўляную галерэю і яшчэ адзін балкон. Недалёка ад будынка знаходзіўся жывапісны пруд, які зараз амаль знішчаны, і меўся сад.

Аб унутраным інтэр'еры дома гаварыць зараз нельга. Вядома толькі, што быў драўляны стол (сталешніца) і стул, якія зараз знаходзяцца ў Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак быў нацыяналізаваны. У 1928 г. Бабічаў раскулачылі і саслалі ў Сібір. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў сядзібным доме немцы абсталявалі шпіталь для паране-

ных салдат. Пасля вызвалення Сенненшчыны ад фашысцкіх захопнікаў у будынку знаходзілася школа. Прычым пачатковая школа працавала амаль да канца XX ст [2].

Сянно ў пачатку XX ст. з'яўлялася тыповым яўрэйскім паселішчам. На скрыжаванні вуліц Віцебскай, Мічурына, Чырвонаармейскай у г. Сянно знаходзіцца месца старажытных яўрэйскіх могілак. Да нашага часу тут захаваліся надмагільныя помнікі-камяні, валуны з надпісамі на іўрыце [1, с. 34–35]. Восенню 1941 г. у наваколлі немцы ўтварылі яўрэйскае гета. 31 снежня 1941 г. вязні гета былі расстраляныя немцамі на іншых старажытных яўрэйскіх могілках каля в. Казлоўка Нямоўтаўскага сельскага савета. Там таксама да нашага часу захаваліся надмагільныя помнікі-камяні з надпісамі на іўрыце. На месцы расстрэлу ўсталяваны помнік [1, с. 51]. Як яўрэйскія могілкі ў г. Сянно так і ў в. Казлоўка, на наш погляд, павінны быць узяты пад ахову дзяржавы.

У дадзенай публікацыі прыведзены не ўсе культурныя каштоўнасці раёна якія павінны быць узяты пад ахову дзяржавы. Так у 2014 г. быў апублікаваны артыкул кандыдата гістарычных навук, дацэнта М.В. Півавара «Гісторыка-культурныя каштоўнасці і помнікі прыроды, выяўленыя ў час правядзення гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта ў 2013 г.», у якім шла гаворка пра неабходнасць надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Успенскай царкве ў в. Обаль Машканскага сельскага савета і статусу помніка прыроды дубу-волату каля в. Александрова Багушэўскага сельскага савета [3].

Такім чынам, на Сенненшчыне хапае культурных каштоўнасцей, якія павінны могуць быць узяты пад ахову дзяржавы. Але ў першую чару варта звярнуць увагу на тыя помікі архітэктуры, якія «дажылі» да нашага часу і якія могуць без адпаведнага нагляду згубіць сваю аўтэнтычнасць і знікнуць.


1. Бандарэвіч В.В. Экскурсія да вытокаў г. Сянно: краязнаўчы маршрут па раённым цэнтры Віцебскай вобласці / распрац. В. В. Бандарэвіча. – Віцебск, 2000. – 216 с.
2. Вёска Рамшына. Сядзібны дом Бабічаў / падрыхт. А. Лазюк // Голас Сенненшчыны. – 2018. – 28 крас. – С. 4.
3. Півавар, М.В. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і помнікі прыроды, выяўленыя ў час правядзення гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта ў 2013 г. / М. В. Півавар // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XIX (66) Регион. науч.-практ. конференции преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 13–14 марта 2014 г.: в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2014. – Т. 1. – С. 348–350.